УДК 37.012

# ПЕДАГАГІЧНАЯ ДЫЯГНОСТЫКА Ў ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ: СУТНАСЦЬ, ФУНКЦЫІ, ПРЫНЦЫПЫ АРГАНІЗАЦЫІ

**Савіцкая І. У., канд. філал. навук, дацэнт,**
**Сахончык А. П., старшы выкладчык**
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт,*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Анатацыя: у артыкуле раскрываецца паняцце і сутнасць педагагічнай дыягностыкі ў сістэме работы педагога, вызначаны яе мэта і функцыі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, а таксама прынцыпы арганізацыі.

Ключавыя словы: вучэбна-выхаваўчы працэс, педагагічная дыягностыка, педагагічная дзейнасць, метады дыягностыкі.

# PEDAGOGICAL DIAGNOSTICS IN THE EDUCATIONAL PROCESS: ESSENCE, FUNCTION, PRINCIPLES OF ORGANIZATION

**Savitskaya I. V., associate professor,**
**Sahonchik A. P., senior lecturer**
*Belarusian National Technological University,*
*Minsk, Republic of Belarus*

Summary: in the article discovered the concept and essence of pedagogical diagnostics in the teacher's work system, highlighting its purpose and function in the educational process, as well as the principles of the organization.

Keywords: educational process, pedagogical diagnostics, pedagogical activities, diagnostic methods.

У розныя часы з розных бакоў разглядалася праблема даследавання навучэнцаў. К. Д. Ушынскі пісаў: «Калі педагогіка хоча выхаваць чалавека ва ўсіх адносінах, то яна павінна перш за ўсе даведацца пра яго таксама ва ўсіх адносінах» [1, с. 237].

Дыягностыка ў рабоце педагога, комплекснае вывучэнне асобных навучэнцаў і ўсей групы ў цэлым з'яўляецца часткай параўнальна новага напрамку – педагагічнай дыягностыкі, якая ўяўляе сабой сістэму дзеянняў па вывучэнні педагагічнага працэсу, вызначэнні і аналізе вынікаў навучання. Пад педагагічнай дыягностыкай разумеюць сістэму ўзаемадзеяння выхавацеляў і вахаванцаў, змест якой складае даследаванне і ператварэнне выхаванца. Яе мэтай з'яўляецца атрыманне аб'ектыўнай інфармацыі для кіравання якасцю вучэбна-выхаваўчага працэсу, павышэнне эфектыўнасці педагагічнай дзейнасці.

Дыягностыка ўключае ў сябе кантроль, праверку, ацэньванне, назапашванне статыстычных дадзеных, іх аналіз, выяўленне дынамікі, тэндэнцый, прагноз далейшага развіцця падзей [2, с. 170]. У дыягностыку ўкладваецца больш шырокі сэнс, чым у традыцыйную праверку ведаў, уменняў навучэнцаў, паколькі праверка толькі канстатуе вынікі, не тлумачачы іх паходжання.

Педагагічная дыягностыка патрэбная не сама па сабе, а «як адваротная сувязь у педагагічнай сістэме для больш аптымальнай арганізацыі педагагічнага працэсу» [2, с. 186]. З гэтага боку навука выдзяляе тры яе функцыі: кантрольна-карэкціровачную, прагнастычную і выхаваўчую.

Першая функцыя складаецца ў атрыманні дадзеных і карэкцыі працэсу выхавання. Другая абазначае прадбачанне, прагноз змен у развіцці навучэнцаў у будучыні. Трэцяя складаецца ў тым, што ў працэсе дыягностыкі педагог мае магчымасць аказваць выхаваўчае ўздзеянне на вучняў.

Абапіраючыся на навукова-метадычныя крыніцы, можна зрабіць выснову пра тое, што сутнасць педагагічнай дыягностыкі заключаецца:

- у збіранні інфармацыі пра аб'ект дыягностыкі;
- у аналізе з мэтай вызначэння прычын удач або няўдач у фарміраванні і развіцці асобы;
- у раскрыцці і тлумачэнні сэнсу змен, якія адбываюцца ў суб'екце дыягностыкі;
- у праверцы ўздзеяння розных дыягнастычных метадаў на суб'ект-аб'ект дыягностыкі.

Вучэбна-выхаваўчы працэс у навучальнай установе мае свае заканамернасці, якія вызначаюць пэўныя патрабаванні ў выглядзе

прынцыпаў правядзення дыягнастычнага даследавання. Найбольш істотнымі з'яўляюцца наступныя:

1. *Прынцып цэласнага вывучэння педагагічнай з'явы.* Ен прадугледжвае паказ разнастайнасці знешніх з'яў, якія ўздзейнічаюць на фарміраванне якасцей асобы, на ход педагагічнага працэсу, а таксама выклад методыкі кіраўніцтва гэтымі з'явамі з боку педагогаў; раскрыцце механізма вывучаемай з'явы, а таксама дакладнае вызначэнне яе месца ў цэласным выхаваўчым працэсе.

2. *Прынцып комплекснага выкарыстання метадаў даследавання.* Ен прадугледжвае шматмэтавую ўстаноўку пры вывучэнні педагагічных з'яў, што адлюстроўваецца ў пастаноўцы некалькіх даследчых задач, вывучэнні сутнасці з'явы, унутраных фактараў, знешніх умоў; ахоп як можна большай колькасці сувязей вывучаемага працэсу з іншымі і выдзяленне з іх самых істотных; улік усіх знешніх уздзеянняў пры правядзенні даследчай работы, ліквідацыя выпадковага ўплыву, які скажае карціну педагаічнага працэсу; шматразовую праверку аднаго і таго ж педагагічнага факта з дапамогай розных метадаў даследавання.

3. *Прынцып аб'ектыўнасці.* Адносіны педагогаў і навучэнцаў пабудаваны часта на зусім суб'ектыўных фактарах: у кожнага настаўніка свая думка пра кожнага вучня; гэтак жа кожны вучань па-свойму разумее і вывучае кожнага настаўніка. Але педагогіка сення не церпіць суб'ектыўных поглядаў у якасці педагагічных ісцін. Навуковыя думкі павінны складвацца на падставе даследаванняў спецыялістаў. Самым галоўным сродкам барацьбы з суб'ектывізмам павінна стаць высокая патрабавальнасць настаўніка да сябе, аналітычны падыход да атрыманых вынікаў, шматразовая праверка любога атрыманага факта.

4. *Прынцып адзінства вывучэння і выхавання асобы.* У сувязі з тым, што педагагічная дыягностыка валодае выхаваўчай функцыяй, яна павінна арганічна ўвайсці ў структуру педагагічнага працэсу. Пры распрацоўцы методыкі дыягнастычнага даследавання важнейшай задачай настаўніка з'яўляецца ўмелае пераўтварэнне дыягнастычных метадаў у метады навучання і выхавання.

5. *Прынцып адначасовага вывучэння калектыву і асобы.* Адна з распаўсюджаных памылак маладых даследчыкаў заключаецца ў тым, што вывучэнне асобы адрываецца ад вывучэння калектыву, распрацоўваецца методыка індывідуальнага вывучэння суб'екта.

Між тым зразумець асобу, ацаніць яе можна толькі ў працэсе вывучэння яе калектыўнай дзейнасці, калектыўных адносін. Вось чаму вывучэнне асобы трэба пачынаць з вывучэння калектыву, у якім гэтая асоба фарміруецца.

6. *Прынцып вывучэння з'явы ў развіцці.* Даследчык імкнецца выявіць сутнасць вывучаемай якасці і прасачыць, як яна ў дадзенай асобы ўзнікае, развіваецца, праяўляецца ў розных умовах. На фоне агульнага развіцця асобы і магчыма вызначыць прыватныя змены. Педагогіка кіруецца тут прынцыпам дыялектыкі: сутнасць вывучаемай з'явы, працэсу, якасці можна вывучыць, зразумець толькі ва ўзаемасувязі з іншымі з'явамі, працэсамі [3, 4].

Такім чынам, кіраванне працэсам навучання і выхавання прадугледжвае адзінства вывучэння і педагагічнага ўзаемадзеяння, інфармацыйную забяспечанасць педагагічнай практыкі. Зыходзячы з гэтага, дыягностыку ў вучэбна-выхаваўчым працэсе можна вызначыць як педагагічную дзейнасць, накіраваную на вывучэнне і разуменне стану аб'ектаў выхавання ў мэтах супрацоўніцтва з імі і кіравання вучэбна-выхаваўчым працэсам.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Ушинский, К. Д. Избранные педагогические сочинения: в 2 т. – Т.1: Теоретические проблемы педагогики / К. Д. Ушинский. – М., 1974. – 584 с.
2. Смирнов, С. Д. Педагогика и психология высшего образования: от деятельности к личности: уч. пособие для студ. высш. пед. учеб. заведений / С. Д. Смирнов. – М.: Академия, 2001. – 304 с.
3. Стефановская, Т. А. Классный руководитель: Функции и основные направления деятельности: учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / Т. А.Стефановская. – М.: Академия, 2006. – 190 с.
4. Борытко, Н. М. Диагностическая деятельность педагога: уч. пособие / Н. М. Борытко. – М.: Академия, 2006. – 284 с.